# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 19 чэрвеня 1997 года, чацвер, № 9(1764)



**СЁННЯ Ў НУМАРЫ:**

Тым, хто цікавіцца новымі камп'ютэрнымі тэхналогіямі, прапануем працягнуць знаёмства з Інтэрнэтам

Стар. 2

Ідзе сесія. Некаторыя студэнты пачынаюць час ад часу гартаць падручнік. Але ці ведаюць яны, як правільна трэба карыстацца гэтым прадметам? Неабходную кожнаму студэнту інструкцыю вы знойдзеце пад рубрыкай "Гэта яшчэ трэба зразумець!" Спадзяемся, што яна дапаможа вам паспяхова здаць сесію

Якія людзі ў Галівудзе!.. А некаторыя з іх не толькі там, але і ў нас, на чвэрцьфінале універсітэцкага КВЗ

Стар. 3

Прайшоў чэмпіянат БДУ па футболу. Лепшы бамбардзір, лепшы варатар, чацвёрка лепшых футбалістаў турніру і, нарэшце, каманда-пераможца — пра ўсё гэта вы даведаецеся з артыкула нашага спартыўнага аглядальніка

Стар. 4


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ТЭЛЕТАЙП

Учора Сёння Заўтра

*ВІНШУЕМ каманду супрацоўнікаў БДУ па футболу з перамогай у чэмпіянаце паміж ВНУ сталіцы.*


## *Шаноўныя студэнты!*

*Калі вы маеце вольны час і жадаеце крыху падзарабіць, звяртайцеся ў аддзел занятасці насельніцтва Маскоўскага раёна (праспект Дзяржынскага, 10, кабінеты 101, 102, 104, 106. Тэл. 220-84-19)*


Для падтрымкі пастаянных кантактаў з удзельнікамі сеткі інфармацыйных цэнтраў Еўрапейскага Саюза з мэтай абмену інфармацыяй БДУ і Камісія ЕС падпісалі пагадненне. Цяпер ва універсітэце створаны Цэнтр еўрапейскай дакументацыі і інфармацыі (ЦЕДІ), які будзе спрыяць распаўсюджванню інфармацыі аб дзейнасці Еўрапейскага Саюза сярод грамадскасці, азнаямленню з праектамі і праграмамі Еўрапейскага Саюза. У БДУ будуць прадстаўляцца звесткі аб патэнцыяльных партнёрах з боку ЕС для міжнароднага супрацоўніцтва.

Цэнтр будзе атрымліваць літаратуру бясплатна. Карыстацца ёй змогуць усе ахвотныя, хто ведае англійскую мову. Невялікая колькасць выданняў ёсць і на французскай мове.

Ёсць у Цэнтры і каталогі літаратуры, па якіх кожны можа выпісаць (за свае грошы) кнігу, што знаходзіцца ў якой-небудзь з бібліятэк краінаў ЕС.

ЦЕДІ будзе камплектаваць, апрацоўваць, захоўваць матэрыялы пра Еўрапейскі Саюз і іншую міжнародную інфармацыю. Гэтая інфармацыя будзе адкрытая і даступная. Акрамя таго, Цэнтр будзе інфармацыйна і арганізацыйна падтрымліваць навучальныя ўстановы ў развіцці прыкладных і навуковых даследаванняў у сферы еўрапейскай інтэграцыі.

Наведвальнікі змогуць атрымаць інфармацыю аб дзейнасці БДУ, бібліяграфічную (літаратура, перыядычныя выданні і інш.), фактаграфічную інфармацыю (навуковыя, палітычныя, культурныя падзеі, установы і асобы). З'явіцца магчымасць карыстацца сучаснымі электроннымі сродкамі камунікацыі (у тым ліку сеткай Інтэрнэт).

Афіцыйнае адкрыццё Цэнтра — 17 чэрвеня ў галоўным корпусе БДУ. А працаваць ён пачне, хутчэй за ўсё, з верасня.

У перспектыве ЦЕДІ будзе арганізоўваць падрыхтоўчыя курсы для супрацоўнікаў і студэнтаў навучальных установаў, якія выязджаюць за мяжу для ўдзелу ў разнастайных праектах і праграмах. Таксама будуць ствараца дыскусійныя клубы, праводзіцца навукова-практычныя канферэнцыі, сімпозіумы, семінары, выставы.

**Фестывалі**

# Вязынка прымала гасцей



Студэнцкі фестываль у Вязынцы сёлета адбыўся 24-25 мая. Гэта традыцыя нашага універсітэта. Упершыню арганізацыяй фестывалю займаўся Студэнцкі саюз БДУ. Паколькі Студэнцкі саюз — арганізацыя маладая, нядаўна ўтвораная, то гэта было для яго першае буйное мерапрыемства.

У сувязі з гэтым хацелася б выказаць падзяку рэктарату, бухгалтэрыі і адміністрацыйна-гаспадарчай частцы БДУ, упраўленню па выхаваўчай рабоце з моладдзю, прафкаму студэнтаў, дэканатам факультэтаў, кафедры фізвыхавання і спорту, спартыўнаму клубу універсітэта, ваеннай кафедры і сталовай БДУ за дапамогу і падтрымку ў арганізацыі і правядзенні фестывалю, а таксама ўсім супрацоўнікам і студэнтам, якія зрабілі гэты фестываль пасапраўднаму яскравым і святочным.

Сапраўды, спартыўныя гульні, творчыя конкурсы праходзілі цудоўна, і дзяўчаты і хлопцы з розных факультэтаў адчувалі сябе адным калектывам — студэнтамі Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Падтрымаць святочны настрой дапамагаў аэрастат з надпісам "Студэнцкі фестываль БДУ-97".

Між іншым, хацелася б адзначыць, што дзякуючы арганізаванай Студэнцкім саюзам службе бяспекі ў час фестывалю не адбылося ніякіх правапарушэнняў.

*Сяргей ДЗІЕСПЕРАЎ, старшыня камітэта Студэнцкага саюза БДУ*

***А.В.ПАЎЛАЎ, прарэктар па вучэбнай рабоце і сацыяльных пытаннях:***

— Арганізацыя фестывалю мне спадабалася. Хаця надвор'е было не вельмі гарачым, студэнтаў было дастаткова многа — болей, чым летась. Гэта было відаць і па палатках (у кожнага факультэта быў асобны палатачны гарадок), і на дыскатэцы, дзе прысутнічала каля 600 чалавек. Больш за ўсё запомніўся азарт студэнтаў, калі яны "балелі" за свае каманды.

Для Студэнцкага саюза гэта першае масавае мерапрыемства. І хочацца сказаць, што ўсё ў яго атрымалася добра.





# Што такое Інтэрнэт

*Мы працягваем знаёміць нашых чытачоў з камп'ютэрнай сеткай Інтэрнэт і прапануем наступны артыкул з серыі матэрыялаў, прысвечаных тым, хто збіраецца працаваць у гэтай галіне.*

## V. Пошук і прыём інфармацыі ў рэжыме Browse

*16. Browse / Search — два рэжымы працы з камп'ютэрызыванай інфармацыяй.*

Web-старонкі, як і старонкі звычайнай кнігі, можна гартаць (англ.: *browse*) — г.зн. паслядоўна пераходзіць ад аднаго дакумента да другога па сістэме гіперсувязяў альбо задаючы іх адрасы (*URL*). Методыку працы ў рэжыме *Browse* мы будзем разглядаць зараз.

У наступнай публікацыі спынімся на рэжыме *Search* — мэтанакіраваным пошуку Web-дакументаў па пэўных іх прыкметах. (Калі гаварыць пра друкаваныя выданні, то рэжыму *Search* адпавядае праца з бібліятэчнымі каталогамі і прадметнымі паказальнікамі).

*17. Як атрымаць дакумент, калі вядомы яго адрас (URL)?*

Будзем лічыць, што ваш браўзар ужо адканфігураваны так, як рэкамендавалася ў папярэднім нумары газеты. Знаёмства з методыкай працы правядзем на канкрэтным прыкладзе — выклічам Галоўную старонку электроннай базы дадзеных *ESToC* "Змест часопісаў выдавецтва *Elsevier Science*" (*http://www.elsevier.nl/estoc/*).

— *URL* таго дакумента, які трэба атрымаць, запісваецца ў адрасным полі *Go to/Location* галоўнага акна *Netscape Navigator*.

Запішыце ў полі *Go to/Location* адрас *http://www.elsevier.nl/estoc/* (пры неабходнасці поле папярэдне ачысціце ад іншага тэкста) і націсніце клавішу *Enter*.

Ваш камп'ютэр пачне ўсталёўваць кантакт з сэрверам выдавецтва, аб чым сігналізуе "ажыўленне" індыкатара — касмічнага малюнка і пераход кнопкі *Stop* у актыўны стан (на ёй загараецца чырвоная кропка).

— Спыніць працэс можна, націснуўшы кнопку *Stop*.

— Аперацыя "націснуць кнопку" азначае: змясціць курсор на кнопку і адзін раз націснуць левую клавішу мышкі.

Паведамленні аб стадыях узаемадзеяння з аддаленым сэрверам вы прачытаеце ў ніжняй частцы акна: *Connect. Contacting host*; *Host contacted. Waiting for reply*; *Document. Received nnn of mmm bytes*; і, нарэшце, *Document Done*. Справа ад гэтых паведамленняў вы ўбачыце індыкатар, які ў графічнай форме будзе паказваць долю атрыманай інфармацыі.

Сярэдняя плошча экрана запаўняецца тэкстам дакумента.

*18. Як выглядае акно браўзара з атрыманым тэкставым дакументам?*

Цяпер на экране вашага камп'ютэра знаходзіцца фрагмент Галоўнай старонкі базы дадзеных *ESToC* (гл. малюнак).

Астатнія часткі дакумента можна ўбачыць, скарыстаўшыся клавішамі *PageDown*, ↑ ці лінейкай скролінга (1).

Ад падкрэсленых словаў (2) пачынаюцца гіперсувязі. Перавядзіце курсор на любы з падкрэсленых тэрмінаў — і ў полі паведамленняў з'явіцца *URL* той Web-старонкі, да якой накіравана гіперсувязь.

Стандартныя іконкі (3) паказваюць месцы, дзе павінны быць малюнкі (*images*).

Стандартныя іконкі (4), абведзеныя каляровымі рамкамі, паказваюць месцы, дзе павінны быць малюнкі з гіперсувязямі (часта, але не заўсёды, побач з такім графічным элементам даецца тэкставае тлумачэнне, куды накіравана гіперсувязь).

*19. Як рухацца ад аднаго дакумента да другога па сістэме гіперсувязяў?*

— Каб перайсці да іншага дакумента па гіперсувязі, трэба паставіць курсор на адпаведны падкрэслены тэрмін і адзін раз націснуць левую клавішу мышкі (далей гэтую аперацыю будзем азначаць словамі "шчоўкнуць па гіперсувязі").

*Практыкаванне*. Выберыце на Галоўнай старонцы *ESToC* найбольш блізкую для вас навуковую галіну і паспрабуйце дайсці па сістэме гіперсувязяў да старонкі са зместам якога-небудзь часопіса.

Выконваючы практыкаванне, Вы будзеце рухацца па ланцужку гіперсувязяў, напрыклад: Chemistry and Chemical Engineering (Навуковая галіна) ® S (Літара, з якой пачынаецца назва часопіса) ® Surface Science (Назва часопіса) ® Volume 366. Issue3. 1November 1996 (Нумар часопіса) ® Змест.

Звярніце ўвагу, што ў полі *Go to/Location* аўтаматычна запісваецца *URL* таго дакумента, які ў гэты час пераносіцца з сэрвера ці ўжо знаходзіцца на экране.

Зазначым яшчэ, што ў любы момант мы можам вызваць іншы дакумент — для гэтага трэба спыніцца (націснуць кнопку *Stop*, калі яна актыўная), запісаць новы *URL* у адрасным полі і націснуць клавішу *Enter*.

*20. Якім чынам можна вярнуцца да ўжо прачытаных дакументаў?*

Па-першае, Web-дакумент звычайна мае гіперсувязі не толькі ўглыб інфармацыйнага масіва, але і да паверхні (а да Галоўнай старонкі — амаль заўсёды).

Па-другое, функцыянальныя магчымасці браўзара дазваляюць хутка, не звяртаючыся да аддаленага сэрвера, выводзіць на экран перанесеныя на Ваш камп'ютэр Web-старонкі.

Кнопка *Back* (першая ў шэрагу інструментальных кнопак) цяпер знаходзіцца ў актыўным стане. Націсніце яе — і на экране з'явіцца папярэдні дакумент. Так, націскаючы кнопку *Back*, можна вярнуцца да Галоўнай старонкі *ESToC*.

Звярніце ўвагу на адну карысную дэталь: словы з гіперсувязямі, накіраванымі да ўжо прачытаных старонак, перафарбаваліся ў іншы колер. Гэта Вам дапаможа арыентавацца ў інфармацыйнай прасторы сэрвера.

Зрушыўшыся ў напрамку да зыходнага дакумента, Вы перавялі ў актыўны стан кнопку *Forward* (другую ў шэрагу інструментальных кнопак) — яе можна скарыстаць, каб зноў паглыбіцца ў масіў.

Гэтыя ж аперацыі можна выканаць і праз меню камандаў (*Go/Back* і *Go/Forward*). Мне ж больш зручным падаецца іншы метад. Як вядома, праграмы, што працуюць у асяроддзі *Windows*, звычайна маюць яшчэ адно меню — кантэкставае, якое адкрываецца правай клавішай мышкі. Змясціце курсор на тое месца дакумента, дзе няма гіперсувязяў і малюнкаў, націсніце правую клавішу — на экране з'явіцца акенца з дзвюма камандамі. Выберыце патрэбны радок (*Back* ці *Forward*) і шчоўкніце па ім.

А як пераскочыць прамежныя стадыі і адразу перайсці да пэўнай старонкі? У меню каманд адкрыйце пункт *Go* — і вы ўбачыце пералік скарочаных назваў усіх дакументаў, з якімі толькі што працавалі. Выбірайце патрэбны і рабіце па ім шчаўчок.

Увага — важны нюанс. Калі Вы зноў пачнеце па гіперсувязях паглыбляцца ў інфармацыйны масіў, але іншым шляхам (напрыклад, будзеце шукаць змест іншага часопіса), у спісе зафіксуецца новы набор дакументаў, а частка старога набора (тое, што цяпер стала адгалінаваннем ад новага) знікне.




*21. Як да тэкставай часткі дакумента дадаць патрэбныя малюнкі?*

Ёсць некалькі варыянтаў выканання такой аперацыі; я лічу, што адзінкавыя малюнкі мэтазгодна вызываць праз кантэкставае меню.

— Каб асобны малюнак уключыць у поле дакумента, трэба змясціць курсор на іконку малюнка, націснуць на правую клавішу мышкі і ў кантэкставым меню шчоўкнуць па радку *Load this Image*.

Калі Вы жадаеце толькі азнаёміцца з малюнкам, але не збіраецеся ўключаць яго ў дакумент, то ў кантэкставым меню трэба шчоўкнуць па радку *View this Image*. Малюнак будзе выведзены ў новае акно; для вяртання да тэкставай часткі належыць націснуць кнопку *Back*.

— Каб у поле дакумента ўключыць адразу ўсе малюнкі, трэба націснуць кнопку *Images* у шэрагу інструментальных кнопак.

Выканайце гэтыя дзеянні, і Вы пераканаецеся, што перанос графічнай інфармацыі сапраўды патрабуе значных выдаткаў часу.

*22. Што рабіць, калі сістэма дае паведамленне аб памылцы?*

Такія паведамленні звычайна дастаткова ясна тлумачаць сутнасць памылкі і даюць рэкамендацыі да далейшых дзеянняў.

Напрыклад, пры вялікай загружанасці аддаленага сэрвера ці лініі сувязі перадача інфармацыі ідзе настолькі марудна, што спрацоўвае ахоўны механізм Інтэрнэту — кантакт перарываецца прымусова (*Operation timed out*). Паслухайцеся парады сістэмы (*Please try again soon*) — вярніцеся да акна, дзе вы запісвалі *URL* (выканайце *Back*), і націсніце кнопку *Reload*, якая знаходзіцца ў шэрагу інструментальных кнопак.

Больш пытанняў можа ўзнікнуць, калі сістэма аб'яўляе *Domain name ... does not exist.* Часцей за ўсё так яно і ёсць — праверце запісаны вамі адрас, ці тыя сімвалы там стаяць. Калі ж памылак у *URL* няма, то такая сітуацыя азначае адно з трох: (1) Вы маеце няправільны адрас; (2) сэрвер змяніў свае каардынаты; (3) як паказала практыка, самае верагоднае — дзесьці на лініі нешта не спрацоўвае. Паспрабуйце вызваць гэты сэрвер на наступны дзень.

## VI. Захаванне атрыманай інфармацыі

*23. Якімі спосабамі можна захаваць атрыманую з Інтэрнэту інфармацыю ?*

Па-першае, дакладную копію дакумента, што ў дадзены момант знаходзіцца на экране, можна надрукаваць на прынтэры (праз меню каманд выканаць *File/Print*).

Па-другое, магчыма скапіраваць тэкст у кліпбард і перанесці яго ў тэкставы рэдактар. Алгарытм аперацыі стандартны: (а) націснуўшы і не адпускаючы левую клавішу мышкі, пазначыць патрэбны фрагмент (для пазначэння ўсяго тэкста неабходна ў меню каманд выканаць *Edit/Select All*); (б) праз меню каманд зрабіць *Edit/Copy;* (в) перайсці ў тэкставы рэдактар і выканаць *Edit/Paste*.

Па-трэцяе, Web-старонку магчыма цалкам захаваць на дыску ў фармаце браўзара, каб потым звяртацца да яе з дапамогай *Netscape Navigator*, але не выходзячы ў Інтэрнэт. Структурна Web-старонка складаецца з тэкставага і графічных файлаў, і таму запіс поўнай інфармацыі — працэс многастадыйны.

*24. Як захаваць тэкставую частку дакумента асобным файлам у фармаце браўзара?*

Выконваецца стандартны набор дзеянняў па запісу інфармацыі на дыск: у меню камандаў выбіраецца пункт *File/Save As...* і ў дыялогавым акне новаму файлу прыдаецца імя і месца ў пэўным каталогу.

Тэкставыя дакументы, што прыходзяць з *WWW*, найчасцей маюць пашырэнні *.htm* і *.html*, радзей — іншыя (*.shtml*, *.rhtml* і г.д.) ці ўвогуле іх не маюць. Сумненні могуць узнікнуць пад час запаўнення поляў *File name* і *Save file as type* — якім павінна быць трохлітарнае пашырэнне імя? Калі браўзар прапануе свой варыянт — згаджайцеся; калі выбар даручаецца Вам — запісвайце універсальны *.htm*. (Дарэчы, калі Вы плануеце ў далейшым працаваць з дакументам толькі ў тэкставым рэдактары, захоўвайце файл з расшырэннем *.txt*).

Левую частку імя (да пашырэння) можна змяніць на такую, якая спросціць Вам арыентацыю ў рэсурсах свайго камп'ютэра (напрыклад, *a001*, *a002* і г.д.). Апошняя аперацыя, канешне, канчаткова разарве гіпертэкставыя сувязі паміж Web-старонкамі, прынятымі Вамі, але не імкніцеся захоўваць сувязі на дыску — аўчынка вырабу не варта.

*25. Як захаваць графічную частку інфармацыі?*

Кожны малюнак — гэта звычайна асобны файл, і захоўваць яго трэба асобна.

Змясціце курсор на малюнак ці іконку і адкрыйце кантэкставае меню (націсніце правую клавішу мышкі). Выберыце пункт *Save this Image as...*, пасля чаго ў дыялогавым акне назначце месца для файла на дыску. Назву графічнага файла не змяняйце.

*26. Як з дапамогай браўзара праглядаць Web-дакументы з дыска?*

У меню камандаў браўзара выканайце *File/Open File*, пасля чаго ў дыялогавым акне выберыце патрэбны дакумент ці графічны файл. (У полі *List files of type:* папярэдне пазначце радок *All Files (*.*)*, калі імёны вашых файлаў маюць розныя трохлітарныя пашырэнні.)

*27. Як зрабіць, каб і на дыску малюнкі былі звязаны з адпаведным тэкставым дакументам?*

Каб з тэкставага дакумента можна было па гіперсувязі вызваць адпаведны малюнак, каталогавая структура на дыску павінна быць такой, якой яна была ў гэтым месцы на сэрверы. Звычайна (але не заўсёды) бывае дастаткова стварыць для графічных файлаў укладзены каталог *images* у тым узроўні, дзе знаходзіцца тэкставы файл.

Інфармацыю аб патрэбным дрэве каталогаў можна атрымаць з паведамлення, што паступае на экран, калі спробы вызваць малюнак па гіперсувязі аказаліся марнымі. Напрыклад, паведамленне *Netscape is unable to find the file /gifs/homepage/join.gif* азначае, што малюнак *join.gif* павінен быць у каталогу *homepage*, які, у сваю чаргу, павінен знаходзіцца ў каталогу *gifs*. У такім выпадку дастаткова было б стварыць пералічаныя каталогі там, дзе знаходзіцца тэкставы дакумент, перанесці ў іх файл *join.gif* — і потым з задавальненнем назіраць, як упрыгожваецца сухі тэкст.


**А. РАГОЙША**
**Сорасаўскі вучэбна-інфармацыйны цэнтр па хімічнай адукацыі**
**Кафедра агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі**



*На пачатку чэрвеня ў актавай зале галоўнага корпуса БДУ адбыўся канцэрт артысткі тэатра і кіно Л.Чырковай і акцёра маскоўскага тэатра на Таганцы В.Чарняева. Гэта ўжо не першы выступ артыстаў перад студэнтамі і супрацоўнікамі нашага універсітэта.*

*На гэтым канцэрце, як і мінулым разам, пад гітару гучалі песні Уладзіміра Высоцкага. Шчырай падзякай артыстам былі авацыі і букеты кветак.*



# Падарункі для бібліятэкі

У кастрычніку 1996 года фундаментальная бібліятэка універсітэта, як і сам БДУ, адзначыла сваё 75-годдзе. З гэтай нагоды бібліятэкай было арганізавана і праведзена шмат мерапрыемстваў, звязаных з яе гісторыяй і арганізацыяй работы.

На святкаванне юбілею былі запрошаны госці з вузаўскіх бібліятэк Беларусі, кіраўнікі універсітэта, прадстаўнікі міністэрстваў адукацыі, культуры, супрацоўнікі і студэнты БДУ. Госці падарылі бібліятэцы шмат цікавых выданняў, якія папоўнілі фонд аддзела рэдкай і каштоўнай кнігі.

Так, Нацыянальная бібліятэка падарыла вельмі рэдкае выданне "Сборник государственных грамот и договоров, хранящихся в Государственной Коллегии иностранных дел, ч.1". Гэтая частка шматтомнага выдання, надрукаваная ў 1813 годзе, дагэтуль адсутнічала ў фондзе аддзела. З шчырымі пажаданнямі падарыла нам альбом "Вытокі творчасці" бібліятэка Беларускай акадэміі мастацтваў. Альбом мастакоў Рудэнкаў ахвяравалі супрацоўнікі бібліятэкі Віцебскага універсітэта з пажаданнямі натхнення і плённай працы. Факультэт міжнародных адносін падарыў бібліятэцы падручнік па сучаснай рыначнай эканоміцы вядомых прафесараў Масачусецкага Тэхналагічнага інстытута С.Фішара, Р.Дорнбуша, Р.Шмалензі "Эканоміка", выдадзены ў Маскве ў 1993 годзе.

Бібліятэка БДУ мае мноства сталых чытачоў, якія ў святочныя дні прыйшлі сюды, каб выказаць сваю павагу: рэктар універсітэта А.У.Казулін, акадэмік Ф.М.Капуцкі, дэкан хімічнага факультэта Г.А.Браніцкі, прафесары А.І.Зелянкоў, А.А.Гусак, А.А.Круглоў і іншыя.

*Л.П.МІЦКЕВІЧ,*
*заг. аддзела рэдкай і каштоўнай кнігі*



# Инструкция по пользованию учебником

*Введение.* Учебником называется прямоугольно отформованная и отбеленная целлюлозная масса с нанесенными на нее шрифтовыми символами, совокупность которых описывает явления окружающей действительности, которым необходимо быть зафиксированными нервными окончаниями подкорки головного мозга разумных млекопитающих индивидуумов, способствует развитию у вышеупомянутых моноэрудиции и активизации интеллектуальной потенции, усвоению и реализации продуктов цивилизации, произведенных разумными прямоходящими приматами, а также позволяет лояльно игнорировать тенденции парадоксальных эмоций, которые имеют место при чтении оного документа ввиду присутствия явного отсутствия отождествления изложенного вышенаписанного с логическим материализмом.

*Занятие первое*

1. Возьмите учебник за углы большим и указательным пальцами обеих (правой и левой) рук и, стараясь рефлекторно выделять смазочную жидкость в суставные сумки локтевых суставов передних конечностей при их медленном разгибании, осторожно опускайте учебник прямо перед собой, пока он не коснется горизонтальной плоскости, освещенной слева ровным дневным светом интенсивностью в 30 люкс.

Дыхание глубокое, ровное.

2. Если текст оказался перевернутым на 180° (так называемое положение"кверх ногами"), что несколько затрудняет его восприятие, постарайтесь, ни в коем случае не меняя положение текста, пересесть к противоположной стороне стола.

3. Работа с текстом:

а) прочтите название;

б) достаточно;

в) попытайтесь сконцентрировать свою интуицию вокруг полученной информации с целью логического вывода соответствия данной информации какой-либо из имеющихся в наличии дисциплин, нанесенных штриховыми символами на прямоугольно отформированную и отбеленную целлюлозную массу, условно называемую "расписанием" приматами низшего порядка (не путать с прямоходящими разумными), хаотически меняющими свое местоположение в пространстве университета;

г) походите по комнате, встряхнитесь, не волнуйтесь. Дыхание глубокое, ровное;

д) прочтите 1-ую страницу учебника (а затем и другие, например, 2-ю, 3-ю, 4-ю и т.д., т.е. 5-ю, 6-ю 7-ю и остальные, как то 8-ю, 9-ю, 10-ю и прочие страницы), выписывая в конспект незнакомые термины в столбик, интересные стилистические обороты через дефис, фонемы — лесенкой, морфемы — елочкой, латинские пословицы — в косую линеечку, шумеро-аккадские логограммы — в амбарную книгу, эвфемизмы — в книгу жалоб и предложений.

4. Прочтите адрес издательства — выпускателя и фамилию автора-составителя.

5. Возьмите в кулак пачку заранее предусмотрительно генетически разделенных Вами же полиграфических единиц печатной продукции и направьте свои головостопы из исходного пункта в сторону нахождения издательства-выпускателя.

6. Найдите через издательство-выпускателя автора-составителя.

7. Догоните и повалите последнего (придайте его телоорганизму устойчиво горизонтальное положение).

8. Постарайтесь как можно более компактно разместить наибольшее количество отбеленной целлюлозной массы, покрытой шрифтовыми символами различного кегля и гарнитуры (см. введение), в ротовой полости автора-составителя от имени покупателя-потребителя (студента-читателя), стараясь несколько нарушить характер его дыхания, глубокого, ровного.

9. В деканате держитесь спокойно, с достоинством, не сутультесь.

Вас оправдают.

*По А.Кнышеву прошлись, издеваясь и коверкая, В.ТЕЛЯШУК и К.КУРЧЕНКОВА*



## Аперацыя "Увага: дзеці!"

У школах скончыўся навучальны год, у дзяцей дадалося вольнага часу. Бавяць яны яго на вуліцах, блізу дарог. За 4 месяцы гэтага года ў сталіцы адбылося 17 дарожна-транспартных здарэнняў з удзелам дзяцей. З 19 мая па 8 чэрвеня Упраўленнем дзяржаўтаінспекцыі Мінгарвыканкама праводзіўся комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на забеспячэнне бяспекі дарожнага руху дзяцей і падлеткаў.

Шаноўныя дарослыя ўдзельнікі дарожнага руху! Будзьце пастаянна ўважлівымі на дарозе, бо ад вас залежыць бяспека дзяцей.

Працягваюцца парушэнні дарожнай дысцыпліны з боку супрацоўнікаў БДУ. 12 мая за зняважлівае стаўленне да аховы экалогіі былі аштрафаваныя старшыя супрацоўнікі БДУ В.С.Прасаловіч, С.М.Якуценя і інш. За адсутнасць правоў на кіраванне транспартам аштрафаваны студэнт А.Амельчанка. За парушэнне бяспекі дарожнага руху аштрафаваны студэнт К.Хоміч.

Дарога патрабуе строгага захавання дысцыпліны. Будзьце заўжды ўважлівымі.

*А.КУДРАЎЦАЎ,*
*дзяржаўтаінспектар ДАІ Маскоўскага раёна*






# Тэлевізійны Галівуд на базе КВЗ

Ізноў у нашай зале (актавай зале галоўнага корпуса БДУ) не было месцаў. Месцаў не было і на прываконнях, а калі скончыліся прыстаўныя крэслы, для гледачоў адкрылі балкон. Такі аншлаг выклікала чарговае "паседжанне" Клуба вясёлых і знаходлівых — універсітэцкі чвэрцьфінал.

У першы дзень географы і юрысты адкрывалі для сябе і нас планету Галівуд. На КВЗ вярнуўся СТЭМ — студэнцкі тэатр эстрадных мініяцюр, у якім спрабавалі сябе нашыя акторы. Як сказаў член журы Сяргей Балцэвіч, хаця нашым "зоркам" яшчэ далёка да галівудскіх, гэта І добра: яны радуюць нас тут і зараз і, у адрозненне ад амерыканскіх, умеюць жартаваць.

Не ведаю, як там у Галівудзе, а вось "у нас, на "Беларусьфільме" (так называлася размінка):

усім жанчынам падарылі на 8 сакавіка духі ад "Іў Сен-Ларана", а мужчынам — компасы ад "Іван Сусанін";

знялі працяг "Вожыка ў тумане"... праўда, атрымаліся ўсё тыя ж "Людзі на балоце".

І жарцік з шэрагу недасягальных, на жаль, мараў: на "Беларусьфільме" паніка — атрымалі "Оскара".

Адсутнасць сапраўднай барацьбы ў першы дзень (гісторыкі па загадкавых тэхнічных прычынах ад гульні адмовіліся, і ў паўфінал выходзілі абедзве каманды) была кампенсаваная на другі.

Рэформы на БТ спрабавалі правесці ФПМІ, мехмат і ФЭФ (гульня называлася "Viva TV"). Відаць, гэта ў іх атрымалася, бо адзін з суддзяў прызнаўся, што калі каманды будуць запрошаныя на БТ, то ён пачне яго глядзець...

У размінцы каманды расказалі пра некаторыя з гэтых зменаў:

"Калыханку" адмянілі не таму, што дзіцячыя праблемы нас болей "не колышут", а таму, што ў Бусліка з'явіўся брацік, а "Два буслы" — гэта ўжо не дзіцячыя гульні;

канцэрт "Иванушки-International" быў адменены, бо перад імі Ірына Алеграва праспявала "Я тучи разведу руками".

Карацей, БТ і "Беларусьфільм" былі прызнаныя невычэрпнымі крыніцамі жартаў, а піва "Портэр" — лепшым за "Сяброў", асабліва калі сяброў многа, а піва мала.




Усё журы пагадзілася, што каманды былі добра падрыхтаваныя, што гульня была цудоўнай (між іншым, у яе арганізацыі "вінаватыя", як заўсёды, рэктарат, дырэкцыя па справах культуры БДУ і прафкам студэнтаў).

*А зараз некалькі жартаў з гульні:*

— Чаму Атэла менавіта задушыў Дэздэмону?

— Сапраўдны джэнтльмен не можа ўдарыць жанчыну.

Учора ў тралейбусе з надпісам "Цік-Так" ехалі такія дзве калорыі!..

— Учора ў Мінск з Гомельскай вобласці прыехаў дзіцячы калектыў "Сонейка". Дзеткі проста свецяцца...

— Ад шчасця?

— Ды не... Ад Гомельскай вобласці.

Ён чалавек новы, крыху рускі...

Барыс Маісееў падаў у суд на групу "Дзюна" за песню "Наш Борька — бабник".

Учора каля піўнога ларка за адзін рубель давалі... па мордзе.

*Крысціна КУРЧАНКОВА*

# Чэмпіёнамі сталі юрысты

*Два з паловай тыдні універсітэт знаходзіўся на "ваенным становішчы": праводзіўся чэмпіянат факультэтаў БДУ па футболу.*

У групе А не было роўных геафаку. Толькі мінулагоднія чэмпіёны, радыёфізікі, капітулíравалі з больш-менш прыстойным лікам (1:4). А міжнароднікам зусім не пашчасціла (2:9). Спыніцца на гульнях больш падрабязна няма ніякага сэнсу: усе 50 хвілінаў кожнага матча на полі гаспадарылі географы. Кожную нясмелую спробу сапернікаў пашкодзіць зводзілі на нішто Андрэй Саевіч і Барыс Гарбачоў: ні ў Віці Толкача, ні ў другога варатара Мішы Лукашэвіча праблемаў не было ніякіх. У абароне з'явіўся цікавы першакурснік Андрэй Гузін. Сапернікі не спраўляліся з Ягорам Канончыкам, Віталём Бештанем, Аляксандрам Дзябкіным.

А вось іх лідэр Дзмітрый Кадакоў толькі час ад часу радаваў сваіх прыхільнікаў ювелірнай тэхнікай, добрай перадачай ці выдатным голам. Затое Цімура Швакеля на трыбунах празвалі Гердам Мюлерам. Праседзеўшы ўвесь леташні чэмпіянат на лаўцы запасных, Цімур надоўга запомніцца сваім удзелам у сёлетнім: з 34 мячоў геафака — 15 ягоныя.

На другім месцы апынуліся фізікі. Лепей бы географы не закідвалі ім у першым матчы сем мячоў. Каманда мабілізавалася і "раззлавалася". Разгуляліся Грыгорый Абуладзе, Дзмітрый Русальскі.

Магчыма, для іншай каманды трэцяе месца ў групе — гэта поспех, але толькі не для радыёфізікаў. А пры іхнай зусім невыразнай гульні ўвогуле адмаўляешся верыць, што перад табою экс-чэмпіёны. Прыглянуўся хіба што Сяргей Лісіменка, ды пазней разгуляўся мінулагодні "крыўдзіцель" мехмата Улад Цігін (забіў 2 "заляных" мячы).


Мішка.Мішка дзе твая усмешка?


Цімур забіў чарговую "чацверку"

Парушальнікі спакою ў групе — **журналісты.** Нечакана для ўсіх перад апошнім турам яны займелі рэальныя шансы выйсці ў фінал. Для гэтага патрэбна была ўсяго толькі перамога над суседзямі-фізікамі. Аднак — нічыя, што задавальняла фізікаў.

**Факультэт міжнародных адносін**ў пачаў даволі моцна. Аднак сказаўся недахоп менавіта футбольнага вопыту. На полі хапала баскетбалістаў, гіравікоў, а вось футбалістаў...

**Хімікі...** Іх прыхільнікі прасілі моцна не крытыкаваць гэтую каманду. Пяць гульняў — пяць паражэнняў. Адзін мяч забілі, чатырнаццаць прапусцілі.

**Турнірнае становішча камандаў у групе А**

| | | |
|---|---|---|
| 1. | Геафак | 15 ачкоў |
| 2. | Фізфак | 8 ачкоў |
| 3. | Радыёфізікі | 7 ачкоў |
| 4. | Журфак | 7 ачкоў |
| 5. | ФМА | 6 ачкоў |
| 6. | Хімфак | 0 ачкоў |

У групе В не было ніякіх сюрпрызаў і нечаканасцяў. Юрысты, як і географы, расправіліся з усімі, але не так лёгка.

**Юрысты** — адна з нешматлікіх камандаў (у дадатак да мехмата і журфака), што мае чалавека, які карэктуе гульню хлопцаў "з-за броўкі" ці, калі вам больш падабаецца, з трэнерскай лаўкі. Віталь Цімафеевіч удзельнічаў у першай гульні юрфака супраць мехмата. Але... купіна ля варотаў саперніка і — гіпс. Ён па-за полем, але не па-за гульнёй.

*— Віталь, як ты апынуўся на трэнерскім мосціку юрфака?*

— Крыкі з трыбуны не заўсёды аб'ектыўныя. А я каманду добра ведаю, і каманда ведае мяне. А ў полі гульню карэктуе Паша Лутовіч.

*— У камандзе вопытныя ігракі. Яны слухаюцца цябе?*

— Калі-нікалі. Мне ж збоку добра відаць, дзе і хто знаходзіцца.

**Мехмат.** Міша Лукашэвіч (не блытаць з варатаром геафака), Міша Лукашэвіч і яшчэ раз Міша Лукашэвіч. Ён працаваў за ўсю каманду. Яго першы гол у матчы з гісторыкамі (і соты ў чэмпіянаце) можа прэтэндаваць на лепшы ў сезоне: наймагутнейшы ўдар метраў з 20-ці ў дальнюю "дзевятку".

**Філфак.** Запомніўся разгром гістфака (9:1) і "нічыя" з юрыстамі.

Нічога асаблівага нельга сказаць пра ФЭФ і ФПМІ. **Гісторыкі** — тое, што і хімікі. Толькі розніца больш унушальная (3:27).

**Турнірная табліца групы В**

| | | |
|---|---|---|
| 1. | Юрфак | 13 ачкоў |
| 2. | ММФ | 12 ачкоў |
| 3. | Філфак | 7 ачкоў |
| 4. | ФЭФ | 6 ачкоў |
| 5. | ФПМІ | 6 ачкоў |
| 6. | Гістфак | 0 ачкоў |

Фінальную групу распачаў матч паміж геафакам і ММФ. Геафак падышоў з вялікімі стратамі: іспыты ў Канончыка, Саевіча, Гарбачова, няма Кадакова. А мехмат злавіў сваю гульню. і з удару Рамановіча адкрыў лік. Праўда, географы змаглі адыграцца. Гульня была вельмі нервовай, і варатар геафака Віця Толкач саступіў сваё месца Міхаілу Лукашэвічу (не блытаць з капітанам мехмата). Матэматыкі атрымалі права на штрафны, і Міша Лукашэвіч (мехмат) забіў мяч Мішу Лукашэвічу (геафак). Лік так і застаўся 2:1 на карысць мехмата.

Юрысты, не вельмі моцна напружваючыся, адолелі фізікаў (5:2).

Усё павінна было вырашыцца ў апошні дзень, 28 мая. Праўда, юрыстаў віншавалі ўжо загадзя: для перамогі ім хапіла б згуляць з геафакам унічыю. На фізікаў усе глядзелі як на смяротнікаў: думалі, мехмат заб'е ім столькі, колькі пажадае. Але... фізікі выйгралі з лікам 4:3

На трыбунах жартавалі: адзін "суперфінал" (матч за 11-12 месцы) не адбыўся праз няяўку гісторыкаў, а што будзе ў другім (юрфак — геафак)? На мой погляд, гульня не атрымалася. На матч сабралася ўся футбольная эліта геафака. Але юрфак з першых жа хвілінаў гуляў беспамылкова і стаў чэмпіёнам з лікам 2:0.


Аляксандр Ластоўскі

Другакурснік юрфака Саша Сямашка ў цэнтры падзеяў бывае не вельмі часта. Ён больш выконвае чарнавую працу: праходы па флангу, вывады партнёраў на ўдарныя пазіцыі, прастрэлы, навесы — менавіта такія дзеянні прыводзяць у рух адладжаную машыну юрфака.

*— Саша, упершыню ты заявіў пра сябе на універсітэцкім першынстве год таму...*

— З трох галоў юрфака ў фінальнай серыі два былі мае. Я гуляю ў футбол з 2-га класа ў бараналавіцкай СДЮШ у Васіля Драгуна. У нас была моцная каманда, удзельнічалі не ў адным турніры. Таму, магчыма, і ўліўся ў каманду юрфака даволі лёгка.


Віталь Цімафеевіч

*— Слабое месца юрыстаў?*

— Нясыгранасць. Акрамя гэтых чэмпіянатаў мы нідзе разам не гуляем. Не заўсёды адразу разумеем адзін аднаго на полі.

*— Калі назіраць за табой на полі, то можна заўважыць, што ты больш працуеш на іншых, чым на сябе.*

— Мяне яшчэ ў спортшколе вучылі не шкадаваць мяча. Вядома, вельмі прэстыжна самому забіць гол, але я так прывык. Галявы пас цэніцца не менш.

**Выніковая табліца**

1. Юрысты
2. Географы
3. ММФ
4. Фізфак
5. Радыёфізікі
6. Філфак
7. Журфак
8. ФЭФ
9. ФПМІ
10. ФМА
11. Хімфак
12 Гістфак

Лепшым бамбардзірам турніру стаў географ Цімур Швакель (15 мячоў).

Вызначыць лепшага варатара, з аднаго боку, было няцяжка, а з другога — складана. Варатары — слабое месца многіх камандаў. Колькі мячоў яны самі сабе пазапіхвалі! Аднак лепшы існуе — Аляксандр Ластоўскі (журфак):

*— Я? Не чакаў. Мне больш спадабаўся Віця Толкач з геафака. Праўда, дзякуючы выдатнай абароне географаў у яго працы амаль не было, таму і не змог праявіць сябе. А я шукаю сваю віну ў кожным прапушчаным мною мячы.*

І — тройка лепшых футбалістаў турніру (праўда, яна расцягнулася да чацвёркі). Мабыць, лягчэй за ўсё было выявіць сапраўды лепшага — капітан мехмата Міхаіл Лукашэвіч на парадак мацнейшы за ўсіх іншых. Праўда, пасля паражэння ад фізікаў на яго было балюча глядзець: хвілінаў пяць ен у самоце сядзеў на полі, паклаўшы галаву на калені. Усміхаўся пасля гэтага сумна, размаўляў без запалу.

*— У якую каманду цябе запрасілі пасля гэтага турніру?*

— Ні ў якую. Ёсць зацэпкі ў другой лізе. Але яшчэ год навучання, а потым — войска. Што будзе далей, ніхто не ведае. Праўда, не выключаю магчымасці пайсці ў прафесійны футбол.

На другім месцы — варатар журфака Саша Ластоўскі.

А вось трэціх — двое: Цімур Швакель (геафак) і Паша Лутовіч (юрфак).

*Вось і ўсё. Чакаем год.*

***Вольга КАЗДЗЕРКА***

***Фота А. ЮРЫНА***

**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**
Заснавальнік газеты - БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

*Газета надрукавана на Мінскай паліграфічнай фабрыцы "Чырвоная зорка" МВПА імя Я.Коласа. 220079, г. Мінск, 1-ы Загарадны зав., 3.*
*Ум. друк. арк. 1*
*Падпісана ў друк у 12.00.*

*19 ЧЭРВЕНЯ*
*Зак. 1793*
*Т. 1000 экз.*
*Бясплатна*

*Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 9, паверх 4, пакоі 411-412, тэлефон 2206827.*

В.а. рэдактара
Т.М. КАЗАК

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР*